***У канцы красавіка ў рамках Міжнароднага навукова-практычнага семінара "Прафесійныя кампетэнцыі сучаснага кіраўніка як фактар развіцця адукацыйнай сферы", арганізаванага Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі і грамадскім аб'яднаннем "Беларускае педагагічнае таварыства", прайшла стэндавая прэзентацыя "Перавагі і эфекты сеткавага метадычнага ўзаемадзеяння ў адзінай адукацыйнай прасторы".***

# Інавацыйны вопыт — у масавую практыку

Інавацыйны праект "Укараненне мадэлі Рэспубліканскага інавацыйнага цэнтра як кампанента адзінай адукацыйнай прасторы" рэалізуецца АПА з 2015 года. Яго кансультантамі з'яўляюцца прарэктар акадэміі па навукова-метадычнай рабоце Галіна Іванаўна Нікалаенка, начальнік цэнтра інавацыйных тэхналогій Іван Віктаравіч Фёдараў, метадыст цэнтра развіцця дапаўняльнай адукацыі дарослых АПА Ала Васільеўна Мацукевіч .

Удзельнікі інавацыйнага праекта — 23 установы адукацыі розных тыпаў з усіх рэгіёнаў рэспублікі: гімназіі, школы, вучэбна-педагагічныя комплексы, спецыяльны яслі — дзіцячы сад, дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці, цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. Усе яны аб'яднаны агульнай ідэяй — зрабіць інавацыйны вопыт лепшых устаноў краіны агульным здабыткам сістэмы адукацыі краіны.

Мэта праекта — рэалізацыя кірункаў і стратэгіі развіцця сістэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі педработнікаў праз дзейнасць рэспубліканскага інавацыйнага цэнтра. Усе гэтыя ўстановы адукацыі ў выніку рэалізацыі інавацыйных праектаў назапасілі дастаткова эфектыўны інавацыйны вопыт або інавацыйную практыку. Акрамя таго, яны валодаюць інавацыйным патэнцыялам: маюць арганізацыйныя, кадравыя, метадычныя, матэрыяльныя рэсурсы, якія дазваляюць гэтую практыку трансліраваць, вучыць іншых яе выкарыстанню. Яны вучаць іншых таму, што эфектыўна навучыліся выкарыстоўваць самі.

Як падзначыла адзін з кансультантаў праекта А.В. Мацукевіч, кожная з 23 устаноў адукацыі мае свой інавацыйны патэнцыял. У адпаведнасці з ідэяй праекта, яны павінны прапаноўваць педсупольнасці вопыт па прыярытэтных напрамках развіцця сістэмы адукацыі, што і адбываецца. На сёння гэтыя ўстановы адукацыі транслююць вопыт па фарміраванні кампетэнцый кіраўніка, удасканаленні прафесійнага майстэрства педагога, выкарыстанні сучасных тэхналогій у канкрэтных прадметах (ёсць, напрыклад, структурна-дынамічная мадэль навучання матэматыцы), рэалізацыі профільнага навучання, прафесійным самавызначэнні навучэнцаў, развіцці камунікатыўных кампетэнцый, сацыялізацыі асобы (і дашкольнікаў, і школьнікаў), экалагічным менеджменце, рэалізацыі інклюзіўнай адукацыі.

Усе ўстановы аб'ядноўвае пошук шляхоў, іх апрабацыя і прапанова гатовых алгарытмаў па ўкараненні інавацыйнага вопыту ў масавую практыку. Галоўным механізмам дзейнасці ўстаноў адукацыі з'яўляецца сеткавае ўзаемадзеянне, якое пачыналася з больш цеснага супрацоўніцтва паміж установамі — удзельніцамі інавацыйнага праекта, каб вопыт іх інавацыйнай практыкі стаў даступным для ўсіх. Акрамя таго, у кожнай з 23 устаноў створана свая сетка, якая ўключае ўласную ўстанову, метадычныя кабінеты свайго рэгіёна, абласны інстытут развіцця адукацыі, АПА. У апошні год рэалізацыі праекта яго ўдзельнікі далучаюцца да правядзення практычных заняткаў, чытання лекцый у ІРА, з'яўляюцца ўдзельнікамі працэсу стварэння праграм павышэння кваліфікацыі або іх аўтарамі.

Напрыклад, сярэдняя школа № 25 Мінска працуе над рэалізацыяй інклюзіўнай адукацыі. І вопыт настаўнікаў-дэфектолагаў гэтай школы стаў запатрабаваным на ўзроўні рэспублікі.

Рэалізацыя інавацыйнага праекта прадугледжвае штогадовыя мерапрыемствы па падвядзенні прамежкавых вынікаў з мэтай выпрацоўкі перспектыў яго далейшага развіцця. У 2016 годзе на базе гімназіі № 10 Мінска праводзілася навукова-практычная канферэнцыя ўдзельнікаў інавацыйнага праекта, дзе яны дзяліліся праблемамі, якія ўзнікалі ў ходзе рэалізацыі інавацыйнага праекта, і спосабамі іх вырашэння. У 2017 годзе ўдзельнікі інавацыйнага праекта дзяліліся набытым вопытам на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі па прафесійных кампетэнцыях сучаснага кіраўніка, якая таксама праходзіла ў АПА. У гэтым годзе тэмай сустрэчы стала сеткавае ўзаемадзеянне, якое з'яўляецца самым эфектыўным механізмам дзейнасці рэспубліканскіх інавацыйных цэнтраў.

"Пачыналі мы з выкарыстання платформы сайта АПА і стварэння Google-супольнасці ўдзельнікаў інавацыйнага праекта. На сёння ў нас функцыянуюць тэматычныя сайты па кірунках дзейнасці. Напрыклад, Лугская сярэдняя школа Жлобінскага раёна рэалізуе праект па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу. Гэта невялікая сельская школа ў аграгарадку. Каб прадстаўляць свой вопыт, яны стварылі тэматычны сайт "Наша скарбніца", які забяспечвае ўзаемадзеянне ўдзельнікаў сеткі. Ёсць у нас персанальныя сайты настаўнікаў — удзельнікаў інавацыйнага праекта, блогі, дзе педагогі-інаватары даюць кансультацыі", — працягвала А.В.Мацукевіч.

Стэндавыя прэзентацыі ўдзельнікаў праекта, якія адбываліся ў рамках міжнароднага навукова-практычнага семінара, пераканаўча дэманстравалі перавагі сеткавага ўзаемадзеяння, якое з'яўляецца асноўным механізмам трансляцыі і папулярызацыі эфектыўнага інавацыйнага вопыту. Аб'яднанне інавацыйных рэсурсаў устаноў адукацыі садзейнічае далейшаму развіццю інавацыйнай практыкі і яе выкарыстанню большай колькасцю педагогаў. Так, удзельніца праекта, настаўніца пачатковых класаў Паплаўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы, які распаўсюджвае вопыт па выкарыстанні аўтарскіх электронных комплексаў, падчас рэалізацыі праекта распрацавала 320 урокаў з выкарыстаннем электронных сродкаў навучання для вучняў 1 класа (у адпаведнасці з удасканаленымі праграмамі). Гэтыя практычныя матэрыялы хутка з'явяцца ў часопісе "Пачатковая школа".

"Асаблівая ўвага на стэндавых прэзентацыях была аддадзена ролі кіраўніка ў арганізацыі інавацыйнай дзейнасці, пошуку эфектыўных форм павышэння кваліфікацыі педагогаў у сеткавым узаемадзеянні ва ўмовах адзінай адукацыйнай прасторы. Інавацыйны вопыт па фарміраванні прафесійных кампетэнцый кіраўніка ўстановы адукацыі, стварэнні інавацыйнай адукацыйнай прасторы ўстановы адукацыі прапанавалі дырэктары сталічных гімназій (гімназій № 1 імя Ф.Скарыны, № 10 Мінска).

Удзельнікі праекта прадстаўлялі вопыт кіравання сеткавым узаемадзеяннем. Выклікалі цікавасць стэндавыя прэзентацыі Магілёўскай гарадской гімназіі №1, гімназіі № 2 Оршы, спецыяльнага ясляў-сада Слоніма, якія дзяліліся вопытам стварэння і выкарыстання розных мадэлей сеткавага ўзаемадзеяння з улікам інавацыйнага патэнцыялу ўстановы адукацыі,напрамку дзейнасці, рэгіянальнага кампанента. Напрыклад, адным з удзельнікаў інавацыйнага праекта з'яўляецца Чапукоўскі дзіцячы сад — сярэдняя школа Мёрскага раёна знаходзіцца ў зоне запаведніка Ельня. У школе рэалізуюць праект "Зялёныя школы". У іх сетцы, акрамя ўстаноў адукацыі, шмат сацыяльных і грамадскіх партнёраў, з якімі яны ўзаемадзейнічаюць у рэалізацыі свайго кірунку дзейнасці, таму на стэндавай прэзентацыі яны расказвалі, як арганізаваць такую партнёрскую сетку.

Некаторыя прадстаўлялі вопыт кіравання сеткавым узаемадзеяннем. У большасці быў прадстаўлены вопыт па стварэнні сістэмы павышэння кваліфікацыі педагогаў. Напрыклад, гімназія № 22 Мінска, дзе распрацавалі дакладны алгарытм арганізацыі павышэння кваліфікацыі. Спачатку ўдзельнікі праекта запрашаюць педагогаў на ўрок з выкарыстаннем пэўнай тэхналогіі, затым зацікаўленыя становяцца ўдзельнікамі лекцыі па тэорыі той тэхналогіі, якая выкарыстоўвалася на ўроку. Затым жадаючыя ідуць да настаўніка на майстар-клас, а пасля праводзяцца практычныя заняткі, дзе падобны ўрок (або яго фрагмент) па вывучанай тэхналогіі распрацоўваецца настаўнікамі самастойна", — расказала Ала Васільеўна.

Трэба адзначыць, што гэтае мерапрыемства нарадзіла ідэю далейшага развіцця інавацыйнага праекта. Паколькі ён будзе рэалізоўвацца яшчэ і ў наступным годзе, па выніках стэндавай прэзентацыі было прапанавана ў кардынацыйным рэспубліканскім плане павышэння кваліфікацыі педработнікаў на наступны год стварыць раздзел, дзе ўсе 23 установы змогуць прапанаваць свае мерапрыемствы для ўстаноў адукацыі ўсёй краіны.

**Вольга ДУБОЎСКАЯ.**
*dubowska@ng-press.by*